**УДК 61(091)+613.9(476)**

# ДЫНАМІКА ДЗІЦЯЧАЙ ЗАХВОРВАЕМАСЦІ Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ СФЕРЫ МЕДЫЦЫНСКАГА АБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ПАСТАЎШЧЫНЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX – ПАЧАТКУ XXI стст.

***Д.С. ГРЫЦКЕВІЧ***
***(Прадстаўлена: канд. біял. навук, доц. В.А. ЕМЯЛЬЯНЧЫК)***

*Прааналізаваны дадзеныя Занальнага дзяржаўнага архіва горада Глыбокае аб стане аховы здароўя дзіцячага насельніцтва ў другой палове XX – пачатку XXI стст. Праведзены параўнальны аналіз структуры захворваемасці ў дзяцей ў розныя перыяды развіцця рэгіёна. Разгледжаны асноўныя фактары, якія мелі ўплыў на эпідэміялагічную карціну.*

Стан здароўя дзіцячага насельніцтва з'яўляецца важным паказчыкам якасці працы аховы здароўя і дабрабыту соцыума ў цэлым. Удасканаленне метадаў аховы здароўя дзіцячага насельніцтва патрабуе паглыбленага аналізу інфармацыі аб заканамернасцях фарміравання здароўя дзяцей, ацэнкі медыка-дэмаграфічных паказчыкаў.

У працы выкарыстаны матэрыялы Занальнага дзяржаўнага архіва горада Глыбокае: Гадавыя справаздачы лячэбных устаноў Пастаўскага раёна за 1951 і 1955 год [3, 4], Гадавыя статыстычныя справаздачы па ахове здароўя Пастаўскага раёна за 1964, 1971, 1974, 1978 гг. [6, 7, 10, 11], Статыстычныя справаздачы лячэбна – прафілактычных устаноў Пастаўскага раёна за 1980, 1990, 1994, 2004 гг. [5, 8, 9, 13], Пратаколы паседжанняў камітэта па барацьбе з дзіцячай смяротнасцю за 1972 год [12].

Гісторыя развіцця медыцыны Пастаўшчыны цесна звязана з яе мінулым. Пасляваенныя часы прынеслі раёну шмат праблем і клапот. Востры недахоп медыцынскіх устаноў, кадраў і лекаў прывёў да абвастрэння эпідэміялагічнай сітуацыі. Асабліва востра гэта адчувалася ў сферы аховы здароўя дзяцей. Пераадоленне праблем, што ўзніклі ў гады Вялікай айчыннай вайны, патрабавалі вялікіх матэрыяльных сродкаў. Таму аднаўленне сістэмы медыцынскага абслугоўвання расцягнулася на дзесяцігоддзі.

На пачатку 1950-х гг. ахова здароўя дзяцей знаходзілася на нізкім узроўні. Паводле архіўных дадзеных 1951 г. на Пастаўшчыне найбольшую распаўсюджанасць сярод дзяцей да 3 год набывае востры бранхіт – 22 выпадкі. Таксама ў гэтым годзе рэгіструюцца выпадкі гнойных захворванняў скуры – 19 выпадкаў. Яны ўзнікалі з-за нездавальняючай гігіены сярод мясцовага насельніцтва, антысанітарыі, цяжкіх жыллёвых ўмоў, асабліва ў вёсках. У гэты ж перыяд фіксуюцца дадзеныя аб хваробах зроку, колькасць якіх склала 16 выпадкаў. У большасці сваёй гэта было інфекцыйнае захворванне – трахома. Пагаршэнне зроку маглі выклікаць і адсутнасць нармальнага асвятлення ў дамах, цяжкія ўмовы працы, нездавальняючы ўзровень прафілактычных мер. Таксама ў 1951 г. зарэгістраваны хваробы сістэмы стрававання. Фіксуецца 12 выпадкаў гастрытаў і 5 выпадкаў глістных інвазій. Выяўленне хвароб гэтай группы сведчыць аб нездавальняючых санітарна-гігіенічных умовах жыцця мясцовага насельніцтва. Рэгіструюцца і менш распаўсюджаныя захворванні: хваробы сэрца, траўмы, хваробы органаў слуха [3, а. 22, 30, 54].

У сярэдзіне 1950-х гг. найбольш распаўсюджанымі сярод дзяцей ва ўзросце да 14 год былі хваробы органаў дыхання. Усяго за 1955 г. было зарэгістравана 103 выпадкі вострых запаленняў верхніх дыхальных органаў (28,14% ад агульнай колькасці зваротаў у 1955 г.), 102 выпадкі ачаговай пнеўманіі (27,87%) і 64 выпадка ангін (17,49%). Прычынамі іх былі недастатковы ўзровень прафілактычных мерапрыемстваў, самалячэнне, несвоечасовы зварот за дапамогай ў медыцынскія ўстановы. Таксама ў гэты перыяд зафіксавана 26 выпадкаў дыспепсіі (7,1%) – захворванне органаў стрававання, якое часцей развіваецца ў выніку ўжывання неякасных прадуктаў харчавання [2]. Рэгіструюцца і іншыя захворванні: хваробы эндакрыннай сістэмы, хваробы органаў слуха, траўмы, інфекцыйныя захворванні [4, а. 7, 17, 26, 78].

У сярэдзіне 1960-х гг. асноўны склад дзіцячых захворванняў амаль не змяніўся. На першым месцы па распаўсюджанасці сярод дзяцей да 14 год знаходзіліся хваробы органаў дыхання. Усяго за 1964 г. было зарэгістравана 150 выпадкаў ачаговай пнеўманіі (23,66% ад агульнай колькасці зваротаў у 1964 г.), 136 выпадкаў вострых запаленняў верхніх дыхальных шляхоў (21,45%), 128 выпадкаў грыпа (20,19%) і 107 выпадкаў ангіны (16,88%). Нягледзячы на паступовае паляпшэнне ўзроўня медыцынскага абслугоўвання, у асобных медыцынскіх установах існаваў недахоп медыкаментаў. У гэтым жа годзе зафіксавана 58 выпадкаў апендыцыта (9,15%). Адной з прычын гэтага захворвання магла быць ангіна, паколькі мікраарганізмы, якія ўзнікаюць пад час хвароб органаў дыхання, могуць выклікаюць запаленне апендыкса [1]. Зафіксаваны і іншыя захворванні: траўмы, хваробы огранаў стрававання, інфекцыйныя захворванні [10, а. 34-35, 42, 50, 62, 66, 70].

На пачатку 1970-х гг. эпідэміялагічная сітуацыя змяняецца. Зніжаецца агульная колькасць зваротаў у медыцынскія ўстановы (табл. 1), што можа быць абумоўлена тэндэнцый да змяншэння каэфіцыента нараджальнасці і памяньшэннем колькасці дзяцей. Зніжэнне каэфіцыента нараджальнасці,

у сваю чаргу, тлумачыцца тым, што ў дадзены перыяд у дзетародны ўзрост уступіла малая колькасць жанчын, народжаных у гады Вялікай айчыннай вайны.

Табліца 1

**Колькасць зваротаў у медыцынскія ўстановы Пастаўшчыны (дзеці да 14 год)**

| Год | 1955 | 1964 | 1971 | 1974 | 1980 | 1990 | 1994 | 2004 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць зваротаў | 366 | 634 | 94 | 128 | 767 | 7907 | 10 325 | 13 148 |

У 1971 г. ў Пастаўскім раёне сярод дзяцей да 14 год было зарэгістравана 34 выпадкі гіпертрафіі міндалін і адэноідаў (36,17% ад агульнай колькасці зваротаў у 1971 г.). Гэтае захворванне, як найбольш распаўсюджанае сярод дзяцей, з'яўляецца частым ускладненнем пасля хвароб органаў дыхання. У гэты ж час сярод дзіцячага насельніцтва павышаецца колькасць хвароб сэрца. Сярод іх: актыўны рэўматызм сэрца – 15 выпадкаў (15,96%), хранічныя хваробы сэрца – 10 выпадкаў (10,64%), прыроджаныя анамаліі – 8 выпадкаў (8,51%). Асноўнымі прычынамі гэтых захворванняў могуць быць ускладненні пасля хвароб органаў дыхання, слабасць арганізма не толькі дзіцяці, але і маці. Разам з гэтым пачынае распаўсюджвацца інфекцыйны гепатыт. За год фіксуецца 13 выпадкаў гэтай хваробы сярод дзяцей. Вірус інфекцыйнага гепатыту, як і пры іншых кішэчных інфекцыях, заносіцца ў арганізм бруднымі рукамі, праз прадметы асабістай гігіены, цацкі [11, а. 7-8, 19-20, 31-32, 43-44, 55-56, 67-68].

У сярэдзіне 1970-х гг. эпідэміялагічная карціна застаецца падобнай. У 1974 годзе сярод дзяцей да 14 год фіксуецца перавага хвароб, звязанымі з запаленнем міндалін і адэноідаў. Іх колькасць склала 39 выпадкаў (30,47% ад агульнай колькасці зваротаў у 1974 г.). У гэты ж час зарэгістравана 29 выпадкаў хвароб сэрца (22,66%). Рэгіструюцца і захворванні органаў дыхання. Гэта фарынгіт – 26 выпадкаў (20,31%) і астма – 14 выпадкаў (10,94%). Акрамя гэтага ў матэрыялах пазначаны і іншыя захворванні – хваробы эндакрыннай сістэмы, хваробы нервовай сістэмы, захворванні мочапалавой сістэмы [6, а. 8-9, 21-22, 33-34, 45-46, 57-58, 69-70].

У пачатку 1970-х гг. у сферы аховы здароўя дзяцей на тэрыторыі Пастаўшчыны існавалі пэўныя праблемы. Гэта падцвярджаюць факты, змешчаныя ў пратаколах паседжанняў камітэта па барацьбе з дзіцячай смяротнасцю за 1972 г. У іх адзначаны недахоп транспартных сродкаў для гаспіталізацыі хворых дзяцей, несвоечасовы зварот бацькоў за медыцынскай дапамогай, недастатковы ўзровень дагляда дзяцей медыцынскімі працаўнікамі [12, а. 1–10]. Усе гэта сведчыць пра нездавальняючы стан арганізацыі медыцынскіх мерапрыемстваў і абслугоўвання на пачатку 1970-х гг.

У 1970-х гг. у Пастаўскім раёне зафіксаваны эпідэміялагічны выбух туберкулёзных інфекцый. Закранула гэтае захворванне і дзіцячае насельніцтва. У 1978 г. было зарэгістравана 208 выпадкаў [7, а. 5-6, 11-15, 23-24, 36-37, 48-49, 59-60]. Але ўжо ў 1980 г., з правядзеннем супрацьтуберкулёзных мерапрыемстваў і прафілактыкі, колькасць іх зніжаецца да 51 [8, а. 7-8, 32-33, 45-46, 56-57, 81-82, 92-93].

З надыходам 1980-х гг. назіраецца змяненне эпідэміялагічнай сітуацыі. Адбываецца павялічэнне колькасці зваротаў у медыцынскія ўстановы (Табліца 1). Найбольшую распаўсюджанасць у 1980 г. сярод дзяцей да 14 год набываюць хваробы органаў дыхання – 630 выпадкаў (82,14% ад агульнай колькасці зваротаў у 1980 г.). З канца 1970-х гг. упершыню пачынаюць узгадвацца псіхічныя захворванні, дыягнаставаныя сярод дзяцей. У 1980 г. іх колькасць складае 58 выпадкаў (7,56%). Да псіхічных захворванняў адносілі: адсталасць у развіцці, псіхозы, выкліканыя ў выпадку эпілепсіі, эпілепсія, рэактыўныя псіхозы і іншае. Таксама рэгіструецца гіпертрафія міндалін і адэноідаў – 10 выпадкаў (1,3%). Сярод іншых узгадваюцца хваробы стрававальнай сістэмы, хваробы сэрца, захворванні нервовай сістэмы, хваробы эндакрыннай сістэмы [8, а. 7-8, 32-33, 45-46, 56-57, 81-82, 92-93].

Статыстычныя дадзеныя 1990 года ўтрымліваюць інфармацыю аб росце агульнай колькасці захварэўшых дзяцей ва ўзросце да 14 год (гл. табл. 1). Але гэта магло быць звязана з паляпшэннем узроўня медыцынскага абслугоўвання, павялічэннем колькасці лекавых устаноў і колькасці прафесійнага медыцынскага персанала. Назіраецца павышэнне даверу насельніцтва да афіцыйнай медыцыны і адыход ад выкарыстання традыцыйных сродкаў лячэння. Па-ранейшаму найбольш распаўсюджанымі застаюцца хваробы органаў дыхання, іх колькасць склала 7005 выпадкаў (88,59% ад агульнай колькасці зваротаў у 1990 годзе). Павялічваецца колькасць хвароб нервовай сістэмы – 668 выпадкаў (8,45%). Сярод іх мінeнгіты, энцэфаліты і іншае. Зніжаецца доля колькасць псіхічных захворванняў, зарэгістравана – 78 выпадкаў (0,98%). У гэтым годзе распаўсюджаны і іншыя захворванні: хваробы органаў срававання, хваробы сістэмы кровазварота, захворванні касцёва-цяглічнай і злучальнай тканіны, траўмы, раны [9, а. 68, 70, 72, 74, 78, 80].

У сярэдзіне 1990-х гг. на першым месцы па колькасці выпадкаў сярод дзяцей да 14 год застаюцца захворванні органаў дыхання. У 1994 г. зарэгістравана 7749 выпадкаў (75,05% ад агульнай колькасці зваротаў у 1994 годзе). У гэтым жа годзе назіраецца павышэнне колькасці скуравых захворванняў. Быў зафіксаваны 821 выпадак (7,95%). Расце і колькасць захворванняў нервовай сітэмы. Зарэгістравана 772 выпадка (7,48%). Таксама ў гэтым годзе зарэгістраваны 671 выпадак захворванняў сістэмы

стрававання (6,5%) і 312 выпадкаў атручэнняў і траўмаў (3,02%), атрыманых у выніку няшчасных выпадкаў, дарожна-транспартных здарэнняў [13, а. 15. ст. 80-83, 91-93, 96-99, 102-104, 107-109, 112-114].

З надыходам XXI ст. каардынальных змяненняў у эпідэміялагіянай карціне раёна не назіралася. У Пастаўскім раёне ў 2004 г. па-ранейшаму самымі распаўсюджанымі захворваннямі сярод дзіцячага насельніцтва да 14 год былі хваробы органаў дыхання. Усяго за гэты год зафіксавана 11 387 выпадкаў (86,61% ад агульнай колькасці зваротаў у 2004 г.). Працягвае павялічвацца колькасць хвароб органаў стрававання. У раёне зарэгістравана 611 выпадкаў (4,65%). Назіраецца значны рост захворванняў органаў зроку сярод дзяцей. Парушэнне зроку ў дзяцей можна патлумачыць пагаршэннем стана зрокавай гігіены, нядбайныя адносіны бацькоў да кантролю над правядзеннем вольнага часу іх дзяцей, маларухомы лад жыцця, экалагічная забруджанасць і іншае. Колькасць зрокавых захворванняў у раёне склала 608 выпадкаў (4,62%). Таксама, у 2004 г. зафіксавана 277 выпадкаў хвароб нервовай сістэмы (2,10%) і 265 выпадкаў захрванняў огранаў слуха (2,02%) [5, а. 8-9, 11-12, 15-16, 21-22, 34-35, 47-48].

Такім чынам, цяжкое сацыяльна-эканамічнае становішча, у якім пасля Вялікай айчыннай вайны апынулася насельніцтва, мела значны ўплыў на эпідэміялагічную сітуацыю раёна. Заняпад медыцыны, недастатковая тэхнічная і кадравая база, недахоп медыкаментаў, усё гэта мела ўплыў на ўзровень жыцця ўсяго насельніцтва. Асабліва цяжкая сітуацыя склалася з аховай здароўя дзяцей. У 1950–1960-я гг. найбольшую распаўсюджанасць набывалі прастудныя і інфекцыйныя захворванні. Іх прычынамі з’яўлася недастатковая ўвага з боку медыцынскага персанала і бацькоў, недахоп транспартных сродкаў для гаспіталізацыі, невялікая колькасць медыцынскіх устаноў.

З пачаткам 1970-х гг. эпідэміялагічная сітуацыя ў Пастаўскім раёне змяняецца. Значна змяншаецца колькасць зваротаў у медыцынскія установы. Аднак з 1972 г. пачынаюць фіксавацца выпадкі туберкулёзных інфекцый, значны рост якіх прыпадае на канец 1970-х гг. З 1980 г. ў раёне пачынаюць актыўна праводзіцца медыцынскія мерапрыемствы па папярэджванню і лячэнню туберкуёза, як вынік колькасць выпадкаў рэзка змяншаецца.

У пачатку 1980-х гг. назіраецца рэзкае павялічэнне колькасці зваротаў у медыцынскія установы. Прычынамі такіх змяненняў магло быць паляпшэнне якасці медыцыны і абслугоўвання. На першае месца па колькасці выходзяць хваробы органаў дыхання. Па-ранейшаму, найбольш распаўсюджаны хваробы нервовай сістэмы, інфекцыйныя захворванні. У сярэдзіне 1990-х гг. да асноўнай групы захворванняў далучаюцца скуравыя хваробы, захворванні органаў стрававання.

У пачатку XXI ст. эпідэміялагічная сітуацыя на Пастаўшчыне змяняецца. На гэта мелі ўплыў экалагічныя, сацыяльна-эканамічныя і тэхнічныя фактары. На сучасным этапе развіцця самымі распаўсюджанымі застаюцца хваробы органаў дыхання. Таксама фіксуецца высокая колькасць захворванняў органаў стрававання. З пачатку 2000-х гг. зарэгістраваны рост захворванняў зрока. Выкарыстанне новых тэхналогій і метадаў для правядзення дыягностыкі і лячэння пацыентаў дае падставу для прагназавання пазітыўнай эпідэміялагічнай карціны ў рэгіёне.

## ЛІТАРАТУРА

1. Аппендицит [Электронный ресурс] // Большая медицинская энциклопедия. – Режим доступа: http://bigmeden.ru/article/Аппендицит. – Дата доступа: 3.09.2016.
2. Диспепсия [Электронный ресурс] // Большая медицинская энциклопедия. – Режим доступа: http://bigmeden.ru/article/Диспепсия. – Дата доступа: 3.09.2016.
3. Гадавыя справаздачы лячэбных устаноў Пастаўскага раёна за 1951 год. – Ф. 1174. Воп. 1. Спр. 23.
4. Гадавыя справаздачы медыцынскіх устаноў за 1955 год. – Ф. 1174. Воп. 1. Спр. 42.
5. Статыстычныя справаздачы лячэбна-прафілактычных устаноў Пастаўскага раёна за 2004 год. – Ф. 1362. Воп. 2. Спр. 112.
6. Статыстычныя справаздачы па ахове здароўя Пастаўскага раёна за 1974 год. – Ф. 1362. Воп. 1. Спр. 104.
7. Гадавыя статыстычныя справаздачы па ахове здароўя Пастаўскага раёна за 1978 год. – Ф. 1362. Воп. 1. Спр. 127.
8. Статыстычныя справаздачы лячэбна-прафілактычных устаноў Пастаўскага раёна за 1980 год. – Ф. 1362. Воп. 1. Спр. 141.
9. Статыстычныя справаздачы лячэбна-прафілактычных устаноў Пастаўскага раёна за 1990 год. – Ф. 1362. Воп. 1. Спр. 211.
10. Гадавыя статыстычныя справаздачы па ахове здароўя Пастаўскага раёна за 1964 год. – Ф. 1362. Воп. 1. Спр. 23.
11. Гадавыя статыстычныя справаздачы па ахове здароўя Пастаўскага раёна за 1971 год. – Ф. 1362. Воп. 1. Спр. 75.
12. Пратаколы паседжанняў камітэта па барацьбе з дзіцячай смяротнасцю (1972 год). – Ф. 1362. Воп. 1. Спр. 79.
13. Статыстычныя справаздачы лячэбна-прафілактычных устаноў Пастаўскага раёна за 1994 год. – Ф. 1362. Воп. 2. Спр. 15.